**CONFERENTIA EPISCOPORUM CATHOLICORUM BIELORUSSIAE**
ul. Revolutsionnaja 1a,
220030 Minsk, BELARUS

**КАМІСІЯ БОЖАГА КУЛЬТУ І ДЫСЦЫПЛІНЫ САКРАМЭНТАЎ**
г. Мінск, вул. Кальцова, 153; e-mail: liturgiaminsk@gmail.com

№ 07 / КБК / 26
« 18 » верасня 2026 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
## пра пастаянную паслугу лектараў і акалітаў у дыяцэзіях Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі

*Агульныя палажэнні*

1. Касцёл, здзяйсняючы місію абвяшчэння Евангелля і асвячэння Божага народа, прызнае і развівае дары, якія Святы Дух удзяляе ўсім ахрышчаным. Удзел свецкіх вернікаў у жыцці касцёльнай супольнасці не з’яўляецца дадаткам да служэння духавенства, але вынікае з годнасці хросту, з агульнага святарства вернікаў і з адказнасці за будаванне цела Хрыстовага.
2. Свецкія вернікі ад апостальскіх часоў прымалі актыўны ўдзел у развіцці Касцёла[1]. Таксама і ў нашы дні многія вернікі праяўляюць шчыры клопат пра яго, імкнуцца больш глыбока перажываць сваю рэлігійнасць і жадаюць, каб касцёльныя ўлады адпаведным чынам заўважалі іх здольнасці і таленты. Імпульс, зададзены паўсюднаму Касцёлу Сінодам Біскупаў 2021-2024 гг., дазваляе нам нанова адкрыць і пераасэнсаваць гэту рэчаіснасць у святле выклікаў сучаснасці і актуальных душпастырскіх заданняў.
3. Жывая супольнасць Касцёла найбольш поўна выяўляе сябе ў літургічным святкаванні. Само ж паняцце «Літургія» (ад грэч. *Leitourgia*) этымалагічна адносіцца да феномена агульнай справы або супольнага дзеяння. Таму важна, каб роля свецкіх вернікаў у гэтай сферы была асаблівым чынам канкрэтызаваная.
4. Згодна з кан. 228§1 і кан. 230§1 свецкія вернікі, прызнаныя прыдатнымі, могуць выконваць некаторыя касцёльныя заданні, у прыватнасці – быць прызначаны да пастаянных паслугаў лектара або акаліта. Канферэнцыі Біскупаў ўстанаўліваюць ўмовы адносна асобы, якім павінны адпавядаць кандыдаты на гэтыя служэнні, і вызначаюць шляхі фармацыі, якія неабходна прайсці, каб атрымаць доступ да гэтых служэнняў[2]. Пры гэтым належыць памятаць, што хоць дзеючая дысцыпліна Касцёла прадугледжвае шматлікія формы абвяшчэння Божага слова і прапаведавання, якія могуць быць даручаныя свецкім вернікам, аднак па-за гаміліяй і ў адпаведнасці з кананічным правам і ўласнай прыродай гэтых формаў абвяшчэння Евангелля.

*Адбор кандыдатаў да паслугі лектараў і акалітаў*

5. Першаснае распазнанне паклікання да служэння лектара або акаліта адбываецца ў парафіяльнай супольнасці, дзе кандыдат вядомы сваім жыццём, верай і ўдзелам у

[1] Пар. Дэкрэт аб апостальстве свецкіх «Apostolicam actuositatem», 1.
[2] Пар. *Выніковы дакумент 16-й Звычайнай Генеральнай Асамблеі Сінода Біскупаў «Дзеля Касцёла сінадальнага: камунія, удзел, місія», 75.*

касцёльным жыцці. Ініцыятыва адносна кандыдатуры можа зыходзіць ад самога верніка або душпастыра парафіяльнай супольнасці. Аднак нельга патрабаваць допуску да служэння як асабістага права.

6. Перад пачаткам фармацыі пробашч праводзіць з кандыдатам грунтоўную размову, падчас якой высвятляюцца матывы, разуменне служэння, сямейная і прафесійная сітуацыя, а таксама гатоўнасць да выканання абавязкаў у парафіі.
7. Лектарамі могуць быць як мужчыны, так і жанчыны, якія маюць адпаведныя здольнасці, а таксама адзначаюцца любоўю да Святога Пісання. Ніжэйшая ўзроставая мяжа кандыдата павінна складаць 14 гадоў.
8. З увагі на культурныя і псіхалагічныя асаблівасці беларускага эклезіяльнага кантэксту акалітамі мэтазгодна прызначаць выключна мужчын, узрост якіх не павінен быць меньшым за 35 гадоў.
9. Як будучых лектараў, так і акалітаў павінны характарызаваць перадусім такія якасці, як пабожнасць і руплівае сакрамэнтальнае жыццё, добрая рэпутацыя і прыкладная пастава ў сямейным і прафесійным жыцці, неабходныя інтэлектуальныя здольнасці, наяўнасць адукацыі не ніжэй за сярэднюю, асабістая культура, ахайнасць і знешняя пастава.
10. Не могуць быць дапушчаны да ўстаноўленага служэння асобы, жыццё або публічная дзейнасць якіх супярэчаць веры і маральнаму вучэнню Касцёла, выклікаюць зграшэнне вернікаў або ставяць пад сумненне аўтарытэт касцёльнага служэння.

*Фармацыя і ўстанаўленне лектараў*

11. Фармацыя лектараў павінна адбывацца ў месцах, дзе ёсць магчымасць наладзіць пастаянны дыдактычна-выхаваўчы працэс, паводле адзінай праграмы зацверджанай Канферэнцыяй Біскупаў (канкрэтныя прадметы, колькасць гадзін, тэрмін фармацыі) для ўсяго Касцёла ў Беларусі.
12. Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Беларусі павінна прызначыць краёвага каардынатара фармацыі лектараў, а ў паасобных дыяцэзіях ардынарыі – рэгіянальных (дыяцэзіяльных) мадэратараў з ліку дасведчаных святароў, якія б клапаціліся пра фармацыю ў рэгіёнах. Душпастыры, якія будуць займацца гэтым пытаннем, павінны падыходзіць да справы з пачуццём адказнасці і пазбягаць усялякага фармалізму
13. Біскупы паасобных дыяцэзій, некалькіх або усе разам, павінен вызначыць месца (напр. парафія або араторый), дзе будудзь рэгулярна, згодна з праграмай, праходзіць фармацыйныя сустрэчы будучых лектараў.
14. Праграма падрыхтоўкі лектараў павінна ўключаць:
   - асновы фанетыкі, тэхнікі маўлення і дыкцыі;
   - практыку карыстання літургічнымі кнігамі;
   - агульныя ўводзіны ў Святое Пісанне;
   - веданне месца Святога Пісання ў літургіі;
   - асноўныя палажэнні біблійнай тэалогіі;
   - практычны курс выкананнання паслугі.
15. Пісьмовую заяву кандыдата ў лектары з просьбай аб дыдактычна-выхаваўчай фармацыі передае дыяцэзіяльнаму мадэратару, разам з іншымі дакументамі (копія пасведчання аб хросце і канфірмацыі, копія пашпатра, два фотаздымакі) пробашч, далучаючы да гэтага сваё меркаванне адносна кандыдата, выказаную пісьмова.

16. Асобам, якія жадаюць прыняць паслугу лектара, пасля адпаведнай фармацыі, неабходна прайсці кваліфікацыйную размову з дыяцэзіяльным мадэратарам.
17. Пасля заканчэння фармацыі кандыдаты у лектары павінны здаць адпаведны экзамен, які павінен уключаць практычнае веданне выканання паслугі.
18. Кандыдат у лектары, з ліку мужчын, павінен скіраваць на імя дыяцэзіяльнага біскупа пісьмовую заяву з просьбай аб удзяленні паслугі, а пасля ў вызначаным часе і месцы прыняць яе, удзельнічаючы ў адпаведным літургічным абрадзе – устанаўленні лектараў.
19. Кандыдат у лектары, з ліку жанчын, таксама павінен скіраваць на імя дыяцэзіяльнага біскупа пісьмовую заяву, аднак з просьбай аб удзяленні спецыяльнага благаслаўлення на выкананне абавязкаў лектара, а затым у вызначаным часе, месцы і форме атрымаць яго.
20. Устанаўленне лектараў з ліку мужчын ажыццяўляецца дыяцэзіяльным біскупам. У выключных выпадках можна прадугледзіць дэлегаванне паўнамоцтваў іншаму прэзбітэру.
21. Благаслаўлення на выкананне абавязкаў лектара, якое прадугледжана для жанчын, ажыццяўляецца біскупам або прэзбітэрам.
22. Літургічнае ўстанаўленне лектараў з зіку мужчын і ўдзяленне благаслаўлення на выкананне абавязкаў лектара з ліку жанчын можа адбывацца ў адным месцы і часе, пры гэтым заўсёды ажыцяўляцца адрозным літургічным чынам.

*Заданні лектара*

23. Падчас святой Імшы і іншых літургічных цэлебрацый лектар:
    - чытае Божае слова, за выключэннем Евангелля;
    - калі няма псальміста, выконвае псальм паміж чытаннямі;
    - калі няма дыякана, абвяшчае інтэнцыі агульнай малітвы;
    - са згоды пробашча ажыцяўляе старшынства ў некаторых набажэнствах (Ружанец, Крыжовы шлях);
24. Лектар таксама можа быць далучаны да біблійнай анімацыі парафіі, падрыхтоўкі іншых чытальнікаў, рэдакцыі парафіяльнай інтэрнэт-старонкі, папулярызацыі рэлігійнай літаратуры, арганізацыі батлеек на біблійныя тэмы і іншых адпаведных душпастырскіх ініцыятыў.

*Фармацыя і ўстанаўленне акалітаў*

25. У Каталіцкім Касцёле ў Беларусі на цяперашнім этапе яго развіцця кандыдатамі ў акаліты могуць быць толькі выпускнікі духоўных навучальных устаноў для свецкіх вернікаў, якімі з'яўляюцца Мінскі тэалагічны каледж імя св. Яна Хрысціцеля, Катэхетычны каледж імя Зыгмунта Лазінскага ў Баранавічах, Гродзенскі тэалагічны каледж імя св. Казіміра.
26. Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Беларусі павінна вызначыць краёвага каардынатара фармацыі акалітаў, а ў паасобных дыяцэзіях ардынарыі –рэгіянальных мадэратараў з ліку дасведчаных прэзбітэраўроў, якія б клапаціліся пра фармацыю ў рэгіёнах. Душпастыры, якія будуць займацца гэтым пытаннем, павінны падыходзіць да справы з пачуццём адказнасці і пазбягаць усялякага фармалізму
27. Краёвы каардынатар выконвае функцыю дэлегата Канферэнцыі Біскупаў па справах фармацыі акалітаў, які разам з рэгіянальнымі (дыяцэзіяльнымі) мадэратарамі адбірае кандыдатаў да прыняцця паслугі з ліку жадаючых асобаў, якія атрымалі дыпломы

адной з навучальных устаноў, акрэсленых у п. 18, беручы таксама пад увагу патрабаванні, акрэсленыя ў п. 9.

28. Пісьмовую заяву кандыдата ў акаліты з просьбай аб дыдактычна-выхаваўчай фармацыі перадае дыяцэзіяльнаму мадэратару, разам з іншымі дакументамі (копія пасведчання аб хросце і канфірмацыі, копія пашпатра, копія дыплома каледжа, два фотаздымакі) пробашч, далучаючы да гэтага сваё меркаванне адносна кандыдата, выказаную пісьмова.
29. Асобам, якія жадаюць прыняць паслугу акаліта пасля адпаведнай падрыхтоўкі, неабходна прайсці кваліфікацыйную з дыяцэзіяльным мадэратарам. Кваліфікацыйная размова павінна адбыцца ў любым выпадку, нават калі кандыдат мае ў дыпломе аб заканчэнні каледжа выдатныя адзнакі.
30. Асоба, якая жадае быць акалітам, апрача агульначалавечых і маральных якасцяў, павінна адзначацца грунтоўнымі спецыяльнымі ведамі.
31. Фармацыя акалітаў павінна адбывацца ў месцах, дзе ёсць магчымасць наладзіць пастаянны дыдактычна-выхаваўчы працэс, паводле адзінай праграмы зацверджанай Канферэнцыяй Біскупаў (канкрэтныя прадметы, колькасць гадзін, тэрмін фармацыі) для ўсяго Касцёла ў Беларусі.
32. Біскупы паасобных дыяцэзій, некалькіх або усе разам, павінен вызначыць месца (напр. парафія або араторый), дзе будудзь рэгулярна, згодна з праграмай, праходзіць фармацыйныя сустрэчы будучых акалітаў.
33. Праграма падрыхтоўкі акалітаў павінна ўключаць:
    - Літургія ў жыцці Касцёла;
    - літургічны год; св. Імша – структура і значэнне паасобных частак;
    - Эўхарыстыя як успамін, ахвяра і гасціна;
    - прысутнасць Хрыста ў Эўхарыстыі;
    - умовы годнага прыняцця Святой Камуніі;
    - эўхарыстычны культ па-за св. Імшой;
    - службовае і паўсюднае святарства ў Каталіцкім Касцёле;
    - свядомасць хросту і значэнне пакаяння ў жыцці хрысціяніна;
    - практычны курс выканнання паслугі.
34. Пасля заканчэння фармацыі кандыдаты у акаліты павінны здаць адпаведны экзамен, які павінен уключаць практычнае веданне выканання паслугі.
35. Кандыдат у акаліты павінен скіраваць на імя дыяцэзіяльнага біскупа пісьмовую заяву з просьбай аб удзяленні паслугі.
36. Дыяцэзіяльны мадэратар прадстаўляе біскупу спіс кандыдатаў і іх пісьмовыя заявы, а таксама выказвае пісьмова сваё меркаванне адносна іх.
37. Кандыдат устанаўліваецца ў паслугу дыяцэзіяльным біскупам праз адпаведны літургічны абрад у вызначаны час і вызначаным месцы. У выключных выпадках можна прадугледзіць дэлегаванне паўнамоцтваў іншаму прэзбітэру.

*Заданні акаліта*

38. Акаліту ў адпаведнасці з разважлівым рашэннем пробашча можа быць даручана выкананне наступных функцый:
    - нясенне крыжа ў працэсіі ўваходу;
    - раздаванне, у выпадку патрэбы, вернікам Святой Камуніі;
    - здзяйсненне пурыфікацыі начынняў (аднак, не на алтары, а толькі на крэдэнсе);

- выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту для адарацыі без удзялення благаслаўлення;
- старшынства ў некаторых набажэнствах;
- занясенне цыборыя з Найсвяцейшым Сакрамэнтам у табернакулюм у выключных выпадках;
- у выпадку крайняй неабходнасці – занясенне Святой Камуніі хворым.

*Некаторыя іншыя заўвагі*

39. Лектары і акаліты не атрымліваюць ад Касцёла матэрыяльнага ўзнагароджання за сваю паслугу (пар. Кан 230 § 1).
40. Падчас святой Імшы і набажэнстваў літургічным адзеннем лектараў (мужчын) і акалітаў з'яўляецца альба падперазаная цынгулюмам, калі дыяцэзіяльныя нормы або законны звычай не прадугледжваюць іншага. Для лектараў з ліку жанчын літургічнае адзене не прдугледжана. Іх вопратка павінна быць сціплай і адпавядаць сакральнаму месцу і служэнню.
41. Пацвярджэннем прыняцця паслугі лектара або акаліта з'яўляецца імяннное пасведчанне з фотаздымкам або сертыфікат. Яно, аднак, не дае аўтаматычнага дазволу на выкананне паслугі ў канкрэтнай парафіі. Лектар і акаліт могуць выконваць даручаную паслугу толькі са згоды мясцовага пробашча.
42. Устанаўленне ў паслугу лектара або акаліта мае пастаянны характар і не паўтараецца.
43. Пробашч лектара або акаліта можа звярнуцца да біскупа з пісьмовай просьбай аб прыпыненні або забароне выканання даручанай паслугі. Такая просьба павінна быць абгрунтаванай. Таксама сам лектар або акаліт можа звярнуцца да свайго біскупа з пісьмовым паведамленнем пра адмову ад выканання даручанага задання.
44. Калі лектар або акаліт змяняе месца жыхарства і перасяляецца ў межы іншай дыяцэзіі, біскуп гэтай дыяцэзіі вырашае пытанне пра дазвол на выкананне ўжо прынятай паслугі на сваёй тэрыторыі.

*Зацверджана на 98-м Пленарным пасяджанні*
*Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі*

Гродна,18 верасня 2026г.

ДАДАТАК 1

# ПРАГРАМА ПАДРЫХТОЎКІ
# ДА ПРЫНЯЦЦЯ ЛІТУРГІЧНАЙ ПАСЛУГІ ЛЕКТАРА

## 1. Мэта праграмы

1. Праграма падрыхтоўкі лектараў мае на мэце фармацыю кандыдатаў да годнага і свядомага выканання літургічнай паслугі чытання Божага слова ў парафіяльнай супольнасці (гл. Інструкцыя, 24-25)
2. Праграма фармуе духоўныя, біблійныя, літургічныя і культурна-маўленчыя здольнасці кандыдатаў (гл. Інструкцыя, 16).
3. Тэрмін фармацыі – два гады.
4. Завяршэнне праграмы пацвярджаецца праверкай ведаў і дапушчэннем да лектарскай прамоцыі (гл. Інструкцыя, 18).

## 2. Адказныя асобы

1. За рэалізацыю праграмы ў паасобных дыяцэзіях адказвае рэгіянальны (дыяцэзіяльны) мадэратар, прызначаны ардынарыям з ліку дасведчаных прэзбітэраў (гл. Інструкцыя, 13)
2. Вядзенне заняткаў даручаецца прэзбітэрам, дыяканам і кампетэнтным свецкім вернікам, прызначаным ардынарыям дыяцэзіі па рэкамендацыі дыяцэзіяльнага мадэратара (гл. Інструкцыя, 14).

## 3. Удзельнікі

1. Да праграмы дапускаюцца мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 12 гадоў, якія выяўляюць жаданне служыць Божаму слову (гл. Інструкцыя, 7, 17).

5. Кандыдат павінен вылучацца добрай рэпутацыяй, дысцыплінаванасцю і гатоўнасцю да духоўнага росту (гл. Інструцкыя, 10-11).

# І. СТРУКТУРА І ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

## 4. Напрамкі фармацыі

Праграма складаецца з 4 (чатырох) абавязковых блокаў:

1. Духоўная фармацыя
2. Біблійная фармацыя
3. Літургічная фармацыя
4. Культура жывога слова і фанетычныя практыкаванні

## І. Духоўная фармацыя - 9 гадзін

1. Вера лектара. Давер да Божай дабрыні
2. Паслухмянасць лектара

3. Божы выбар і пакліканне лектара
4. Святасць паслугі лектара
5. Евангелізацыйны абавязак лектара
6. Паслуга лектара дзеля Божай хвалы
7. Барацьба з уласнымі недахопамі
8. Руплівасць і стараннасць лектара
9. Парафіяльны касцёл – другі дом лектара

**Форма працы:** аскетычныя канферэнцыі, адарацыі, індывідуальныя размовы з духоўнымі кіраўнікамі.

**Вынікі:** кандыдат вядзе годнае хрысціянскае жыццё, мае духоўнага кіраўніка, адчувае адказнасць за парафію і супольнасць.

**II. Біблійная фармацыя** - 7 гадзін

1. Працэс узнікнення Святога Пісання. Біблійнае натхненне
2. Навучанне Касцёла аб натхненні і кананічнасці
3. Біблійныя мовы і пераклады
4. Правілы чытання Бібліі
5. Роля Бібліі ў жыцці чалавека
6. Біблія як крыніца натхнення ў малітве
7. Біблія ў літургіі і катэхезе

**Форма працы:** лекцыі, біблійныя гадзіны, індывідуальная лекцыя Пісання.

**Вынікі:** кандыдат разумее асноўныя біблійныя паняцці, адчувае патрэбу чытаць Пісанне, умее маліцца з Бібліяй.

**III. Літургічная фармацыя** - 12 гадзін

1. Нядзеля – першы дзень тыдня
2. Адвэнт і Божае Нараджэнне
3. Вялікі пост
4. Вялікі Тыдзень і Пасхальны Трыдуум
5. Вялікдзень і перыяд Збаўчага дзеяння Хрыста (Велікодны)
6. Звычайны перыяд літургічнага года
7. Святая Імша – уступныя абрады і Літургія слова
8. Святая Імша – Эўхарыстычная літургія і абрады заканчэння
9. Літургічныя нормы – кнігі, рубрыкі, звычаі. Літургічны каляндар.
10. Літургічныя знакі – паставы, жэсты, шаты, колеры, начынне
11. Слоўныя формы ў літургіі – гімны, псальмы, акламацыі
12. Літургічная прастора – касцёл і яго ўнутраная структура

**Форма працы:** лекцыі, практычныя заняткі, актыўны ўдзел у літургіі.

**Вынікі:** кандыдат ведае літургічныя нормы і ўмее выконваць паслугу лектара ў літургічным сходзе.

**IV. Культура жывога слова. Фанетычныя практыкаванні** - 9 гадзін

1. Механізм і фізіялогія маўлення. Эмісія голасу
2. Артыкуляцыя галосных і зычных
3. Перадача акцэнтаў. Сімвалічны і гукапераймальны акцэнт
4. Фразаванне і пунктуацыя
5. Падрыхтоўка тэксту да чытання. Галасавая інтэрпрэтацыя
6. Негаласавыя сродкі выразнасці
7. Чытанне простых і складаных сказаў
8. Чытанне акалічнасных сказаў, устаўных слоў і дужак
9. Чытанне шматскладовых сказаў і пунктуацыя ў іх

**Форма працы:** лекцыі, практыкаванні.

**Вынікі:** кандыдат валодае культурай маўлення і ўмее правільна чытаць тэксты Літургіі слова.

## II. ПРАЦЭДУРЫ І МЕТАДЫ

**1. Арганізацыя**

1. Заняткі адбываюцца паводле зацверджанага графіку (гл. Інструкцыя, 12).
2. Удзел у занятках з'яўляецца абавязковым.

**2. Метады**

1. Лекцыі.
2. Практычныя заняткі.
3. Індывідуальная і групавая праца.
4. Удзел у літургіі.
5. Лекцыя Святога Пісання.
6. Праца з біблійным тэкстам.
7. Аўдыявізуальныя матэрыялы.
8. Дыскусіі.

**3. Дыдактычныя сродкі**

Спецыялізаваная літаратура, «Новы Запавет» (Мінск, 2017 або 2019), Лекцыянарый, Евангеліярый, «Парадак пахавання» (Мінск, 2012,) «Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла» (Мінск, 2010), «Дакументы Другога Ватыканскага Сабору» (Мінск, 2008), «Святая Імша». Сто пытанняў і адказаў (Мінск, 2011), Літургічны каляндар, аўдыявізуальныя матэрыялы, інтэрнэт-рэсурсы, літургічныя кнігі і інвентар.

## III. ЗАВЯРШЭННЕ ПРАГРАМЫ

**1. Праверка ведаў**

1. Па завяршэнні курса кандыдат праходзіць праверку ведаў і навыкаў.
2. Да прамоцыі дапускаюцца толькі тыя, хто засвоіў матэрыял і праявіў духоўную сталасць (гл. Інструкцыя, 18).

**2. Удзяленне паслугі лектара**

1. Лектар абавязваецца служыць Божаму слову з годнасцю, руплівасцю і верай (гл. Інструкцыя, 19-20).
2. Удзяленне паслугі лектара адбываецца падчас літургіі паводле нормаў Касцёла (гл. Інструкцыя, 21-23).

## IV. ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праграма падрыхтоўкі лектараў прызначана для таго, каб кандыдаты ўпэўнена і з любоўю ішлі за Хрыстом, мелі глыбокую пашану да Божага слова і служылі супольнасці праз выразнае, малітоўнае і годнае чытанне Святога Пісання.

ДАДАТАК 2

## ПРАГРАМА ПАДРЫХТОЎКІ
## ДА ПРЫНЯЦЦЯ ЛІТУРГІЧНАЙ ПАСЛУГІ АКАЛІТА

**1. Мэта праграмы**

1. Праграма падрыхтоўкі акалітаў мае на мэце фармацыю кандыдатаў да годнага і свядомага выканання літургічнай паслугі акаліта ў парафіяльнай супольнасці (гл. Інструкцыя, 37)
1. Праграма фармуе духоўныя, біблійныя, літургічныя здольнасці кандыдатаў (гл. Інструкцыя, 31).
2. Тэрмін фармацыі – два гады.
3. Завяршэнне праграмы пацвярджаецца праверкай ведаў і дапушчэннем да прамоцыі (гл. Інструкцыя, 33).

**2. Адказныя асобы**

1. За рэалізацыю праграмы ў паасобных дыяцэзіях адказвае рэгіянальны (дыяцэзіяльны) мадэратар, прызначаны ардынарыям з ліку дасведчаных прэзбітэраў (гл. Інструкцыя, 27)
2. Вядзенне заняткаў даручаецца прэзбітэрам, дыяканам і кампетэнтным свецкім вернікам, прызначаным ардынарыям дыяцэзіі па рэкамендацыі дыяцэзіяльнага мадэратара (гл. Інструкцыя, 28)

**3. Удзельнікі**

1. Да праграмы дапускаюцца мужчыны ва ўзросце ад 33 гадоў, якія выяўляюць жаданне выконаваць паслугу акаліта (гл. Інструкцыя, 8-9, 32).
2. Кандыдат павінен вылучацца добрай рэпутацыяй, дысцыплінаванасцю і гатоўнасцю да духоўнага росту (гл. Інструцкыя, 10-11).

## I. СТРУКТУРА І ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

**4. Напрамкі фармацыі**

Праграма складаецца з 6 (шасці) абавязковых блокаў (з’ездаў):

**I з’езд**
1. Паслугі і функцыі ў літургічным сходзе;
2. Хрост як уводзіны ў патройную місію Хрыста;
3. Паслуга пры эўхарыстычным стале – яе фармаванне і мэта;
4. Агульнае святарства Божага народа.

**II з’езд**
1. Годнае здзяйсненне і ўдзел у Эўхарыстыі паводле вызначэння літургіі;
2. Формы эўхарыстычнага культу і іх спецыфіка;

3. Літургічныя знакі, парамэнты і касцёльнае начынне;
4. Часткі святой Імшы паводле Агульных ўводзінаў да Рымскага Імшала (II раздзел).

**III з’езд**

1. Літургічны год і табліца першаснасці літургічных дзён;
2. Тройца як запрашэнне да адносін стварэння са Стварыцелем – роля, годнасць і заданне кожнай Божай Асобы;
3. Псіхалагічныя паставы паслугі сярод хворых.
4. Розныя формы цэлебрацыі Святой Імшы – паводле Агульных ўводзінаў да Рымскага Імшала (IV раздзел).

**IV з’езд**

1. Як правільна фармаваць сумленне;
   Пагрозы і злоўжыванні пры няправільна сфармаваным сумленні;
2. Ад малітвы падчас святой Імшы да малітвы самой Імшой;
3. Нядзеля як дзень Пана і цэнтр хрысціянскага жыцця;
4. Эўхарыстыя як сакрамэнт – успамін, ахвяра, гасціна.

**V з’езд**

1. Хрыстус, намашчаны Айцом, і спасланне Духа Святога;
2. Малітва як вымярэнне духоўнага жыцця – формы, віды, спосабы і найвышэйшая мэта малітвы;
3. Хрыстус – Адзіны і Найвышэйшы Святар.
   Агульнае святарства і яго сувязь са служэбным святарствам;
4. Містагогія ўводных абрадаў і Літургіі слова;
5. Акаліт – паслуга ў літургічным сходзе.
   Роля, заданні, функцыі і пасланне аколіта.

**VI з’езд**

1. Касцёл як новы Божы народ і спаўненне Запавету.
   Касцёл пілігрымуючы, церпячы і праслаўлены;
2. Літургія Эўхарыстыі і яе містагогія – раней называная «Імша верных»;
3. Паслуга акаліта падчас цэлебрацыі святой Імшы;
4. Малітва, як выраз удзелу ў духоўным жыцці. Літургія гадзінаў. Літургічныя набажэнствы. Літургічны каляндар.

## II. ПРАЦЭДУРЫ І МЕТАДЫ

**1. Арганізацыя**

1. Заняткі адбываюцца паводле зацверджанага графіку (гл. Інструкцыя, 26).
2. Удзел у занятках з’яўляецца абавязковым.

**2. Метады**

1. Лекцыі.
2. Практычныя заняткі.

3. Індывідуальная і групавая праца.
4. Удзел у літургіі.
5. Праца з літургічнымі тэкстам.
6. Аўдыявізуальныя матэрыялы.
7. Дыскусіі.

**3. Дыдактычныя сродкі**

Спецыялізаваная літаратура, «Новы Запавет» (Мінск, 2017 або 2019), «Святая Камунія і культ эўхарыстычнай таямніцы па-за Імшой» (Мінск, 2017), ,) «Кампендый Катэхізіса Каталіцкага Касцёла» (Мінск, 2010), «Дакументы Другога Ватыканскага Сабору» (Мінск, 2008), «Святая Імша». Сто пытанняў і адказаў (Мінск, 2011), Літургічны каляндар, аўдыявізуальныя матэрыялы, інтэрнэт-рэсурсы, літургічныя кнігі і інвентар.

## III. ЗАВЯРШЭННЕ ПРАГРАМЫ

**1. Праверка ведаў**

1. Па завяршэнні курса кандыдат праходзіць праверку ведаў і навыкаў.
2. Да прамоцыі дапускаюцца толькі тыя, хто засвоіў матэрыял і праявіў духоўную сталасць (гл. Інструкцыя, 33).

**2. Удзяленне паслугі акаліта**

1. Акаліт абавязваецца служыць Касцёлу з годнасцю, руплівасцю і верай (гл. Інструкцыя, 34).
2. Удзяленне паслугі акаліта адбываецца падчас літургіі паводле нормаў Касцёла (гл. Інструкцыя, 36).

## IV. ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праграма падрыхтоўкі акалітаў прызначана для таго, каб кандыдаты ўпэўнена і з любоўю ішлі за Хрыстом, мелі глыбокую пашану да Касцёла і служылі супольнасці праз годнае шанаванне Эўхарыстыі.